грамадскага развіцця, збядняе літаратуру, уплывае на лёсы наступных пакаленняў і ўсяго народа.

## Літаратура

1. Заяц, Н. В. Пушча Язэп / Н. В. Заяц // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. – Т. 8 : Беларуская літаратура ; В. У. Ваніна (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 341–344.
2. Пушча, Я. Збор твораў : у 2 т. / Я. Пушча. – Мінск : Маст. літ., 1994. – Т. 2 : Вершы. Паэмы. – 464 с.
3. Трефилов, С. С согласия Сталина в ночь с 29 на 30 октября 1937-го расстреляли 132 белорусских писателя и интеллигента : интервью с Т. Чернякевичем [Электронный ресурс] / С. Трефилов // Комсомольская правда. Беларусь. – 2017. – 27 окт. – Режим доступа: https://www.kp.by/daily/26750.7/3778956/. – Дата доступа: 10.03.2021.

# РАМАН У. ЛІПСКАГА “ЦАР”: БЕЛАРУСКІ МАРШРУТ МАРЫНЫ МНІШАК

*Г. А. Лукашэвіч*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** У артыкуле прасочваецца “беларускі маршрут” Марыны Мнішак, узноўлены ў рамане У. Ліпскага “Цар”. Вызначаецца ідэйная накіраванасць твора.

**Ключавыя словы:** У. Ліпскі; раман; “Цар”; сюжэт; маршрут.

Беларускі празаік У. Ліпскі папоўніў свой багаты творчы набытак, звярнуўшыся да жанру гістарычнага рамана. У 2020 годзе выйшаў яго буйны твор “Цар” (іншая назва – “Царскае каханне”), які вяртае чытача ў глыб стагоддзяў і распавядае пра стасункі царэвіча Дзімітрыя і Марыну Мнішак. Менавіта Марына Мнішак стала першай каранаванай у расійскай дзяржаве жанчынай.

Гісторыя кахання зацікавіла У. Ліпскага і паклала пачатак для стварэння вялікага мастацкага палатна. “Цар” – гэта дэбют пісьменніка ў такім грунтоўным і складаным жанры. Каб надаць пераканаўчасці аповеду, пісьменнік завочна вандраваў па маршруце Марыны Мнішак – з дапамогай вывучэння архіваў, чытання навуковай і мастацкай літаратуры. Аўтар даследаваў літаратальна кожны яе крок ад Брэста да Оршы. А яна ў свой час з абозам у дзве тысячы падвод праехала звыш дваццаці беларускіх гарадоў,

мястэчак, вёсак. Пісьменнік “пражыў” і “прайшоў” маршрут галоўных герояў для таго, каб разгадаць гістарычную таямніцу і ўрэшце адказаць на пытанне: хто пакарыў трон Масковіі – сын Івана Грознага Дзімітрый ці самазванец Ілжэдзімітрый?

Адзін з пунктаў маршруту Марыны Мнішак, Шарашоў, уразіў У. Ліпскага тым, што дамы стаяць там не зусім звычайным спосабам, а быццам бачком. “Там у свой час была іканапісная майстэрня, нядаўна старажытныя працы мясцовай школы пабывалі на выставе ў Ватыкане. У Новым Двары, ля самай Белавежскай пушчы, была рэзідэнцыя каралёў – так што начавала Марына Мнішак у сапраўдных палацы” [3]. Аўтар “паехаў” за жонкай Ілжэдзмітрыя і ў Мікалаеўшчыну, на малую радзіму класіка беларускай літаратуры – Якуба Коласа. Разам з абозам Марыны Мнішак пісьменнік і чытач наведваюць Мір, заязджаюць у Нясвіж да магутных Радзівілаў…

Вядома, сюжэт рамана не абмяжоўваецца падарожжам па Беларусі: пісьменнік запрашае чытачоў саміх разблытаць клубок таямнічых і вельмі супярэчлівых каралеўскіх адносін, разгадаць загадку сына Івана Грознага. Але не менш важны аспект твора – даследаванне Беларусі, даўнейшай і сучаснай, роздум над роляй нашага народа ў гісторыі. “Мы, беларусы, народ еўрапейскі, трывушчы, лагодны, вольны. Адзінае – зразумей і палюбі нас, тады мы адкрыем душу. Бяры, карыстайся, наталяйся, колькі дазваляе твая мараль. <...> Мы хочам жыць у вечным і добрым міры з народамі-суседзямі” [2], – так сфармуляваў У. Ліпскі адну з важных ідэй рамана яшчэ на этапе яго падрыхтоўкі.

Раман прасякнуты любоўю да Беларусі: *“Я жыву на зямлі, якая раней называлася Вялікім Княствам Літоўскім. Тут цяпер мая радзіма Беларусь. Адсюль загарэлася, закруцілася, усчалася, уз’юрылася тая міждзяржаўная, міжчалавечая гісторыя-легенда, якая пякуча хвалюе не адно пакаленне гісторыкаў і пісьменнікаў”* [1, с. 5].

Твор У. Ліпскага валодае вельмі моцным выхаваўчым патэнцыялам, мае каштоўнасць не толькі як мастацкі тэкст, але і як краіназнаўчы матэрыял. Калі пісьменнік сам зацікаўлены тым, што выходзіць з-пад яго пяра, то чытачы гэта адчуваюць, і асабліва падлеткі. Думаецца, раман “Цар” можа быць карысны ў школьнай адукацыі, у прыватнасці, пры вывучэнні гісторыі: кніга У. Ліпскага дапаможа ажывіць сухія факты, зацікавіць вучняў, паказаць сувязь даўніх падзей з сучаснай Беларуссю. У гэтым выпадку гістарычныя звесткі і карціны мінулага не згубяцца ў памяці.

Раман “Цар” – першая спроба У. Ліпскага ў новым жанры і, па нашым перакананні, вельмі ўдалая. Чытач зможа разам з Марынай Мнішак праехаць па даўняй Беларусі, даведацца не толькі пра перыпетыі яе кахання, але і лепш зразумець сваю радзіму.

## Літаратура

1. Ліпскі, У. С. Цар : раман / У. С. Ліпскі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2020. – 352 с.

2. Сенсацыйны раман “Цар” – таямніцы гісторыі вачамі сучасніка [Электронны рэсурс] // Ulej.by. – Рэжым доступу: https://ulej.by/projects/13789. – Дата доступу: 25.03.2021.

3. Трефилов, С. Гипотеза белорусского писателя о Лжедмитрии: Сына Ивана Грозного во времена Смуты мог спасти канцлер ВКЛ Лев Сапега [Электронный ресурс] / С. Трефилов // Комсомольская правда. Беларусь. – 2018. – 3 июля. – Режим доступа: https://www.kp.by/daily/26855.7/3897047/. – Дата доступа: 25.03.2021.

## ЛІТАРАТУРА НОН-ФІКШН: ДА ТЭОРЫІ ПЫТАННЯ

*В. А. Сахар*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** Сістэматызуюцца навуковыя погляды на літаратуру нон-фікш. Прапануецца ўласная дэфініцыя жанру нон-фікш.

**Ключавыя словы:** нон-фікшн; мастацкі твор; жанр.

У апошні час у нацыянальным прыгожым пісьменстве вялікую папулярнасць і распаўсюджанне атрымалі творы катэгорыі нон-фікшн – гэта тэксты, заснаваныя не на выдумцы, а на фактах. У сувязі з гэтым некаторыя даследчыкі трактуюць нон-фікшн вельмі вольна, называючы гэтым тэрмінам шырокі спектр кніжнай прадукцыі.

Значную частку літаратуры нон-фікшн складаюць мастацкія творы, ды і само паняцце ўзнікла ў дачыненні менавіта да тэксту мастацкай літаратуры. Узнікненне жанру датуецца 1965 годам, калі быў апублікаваны раман амерыканскага пісьменніка Трумана Капотэ “Звычайнае забойства” (“In Cold Blood”), які сёння лічыцца першым творам літаратуры нон-фікшн.

У літаратуразнаўстве нон-фікшн часта разумеецца як тэкст, у якім, у адрозненне ад белетрыстыкі, не дапускаецца выдумка, апісваюцца рэальныя гісторыі, падзеі выкладаюцца праз прызму ўспрымання аўтара. Усе падзеі павінны быць заснаваны на дакументальнай аснове. У гэтым літаратура нон-фікшн блізкая да публіцыстыкі.

У сучаснай беларускай літаратуры творы нон-фікшн прадстаўлены вельмі шырока, прыцягваюць увагу крытыкаў, карыстаюцца папулярнасцю ў чытачоў. Сярод падобных кніг творы лаўрэата Нобелеўскай прэміі С. Алексіевіч, “Мае дзевяностыя” А. Бахарэвіча, “Радзіва Прудок” і “Прэм’ера” А. Горвата, “Каменданцкі час для ластавак” А. Брава і інш. Аднак, нягледзячы на вялікую колькасць мастацкіх тэкстаў, да канца не вызначаным застаецца сутнасць

паняцця нон-фікшн, не акрэслены яго межы. Акрамя таго, творы сучасных пісьменнікаў, што пазіцыянуюцца як нон-фікшн, з’явіліся зусім ці параўнальна нядаўна, а таму не паспелі атрымаць належнага навуковага асэнавання.

Даследаваннем літаратуры нон-фікшн у Беларусі займаецца А. Ю. Новік. У грунтоўным артыкуле “Дакументальная проза (нон-фікшн) на мяжы XX–XXI стст.: тэарэтычны аспект” яна сістэматызуе падыходы замежных і айчынных вучоных і вылучае найбольш істотныя характарыстыкі нон-фікшн [1]. Так, пад нон-фікшн разумеюць і “любую літаратурную працу, заснаваную галоўным чынам на факце, нават калі яна ўтрымлівае прыдуманыя элементы” (Г. М. Перэ) [Цыт па: 1, с.19]; і “не толькі навукова-папулярныя сачыненні, філасофскія трактаты, падарожныя нататкі, палітычныя праграмы і кулінарныя рэцэпты, але і, скажам, лірычныя вершы <…> а таксама прыгожае, але небелетрыстычнае пісьменства: эсэ, дзённікі, лісты, гуманітарная проза, уключаючы ўсемагчымыя “раманы-эсэ”, “раманы без хлусні” (А. Геніс) [Цыт па: 1, с. 19].

Расійскі даследчык С. І. Чупрынін заўважае, што “цяпер пад non fiction разумеюць усё, што заўгодна. Так, скажам, у часопісе “Знамя”, дзе для твораў такога роду выдзелена спецыяльная рубрыка, non fiction трактуецца як літаратура, якая змяшчае ў сабе ўсе прыкметы мастацкасці – але толькі за выключэннем выдумкі. <...> гэта слова ўжываецца журналістамі і як сінонім паняцця інтэлектуальнай літаратуры” [2]. Разважаючы пра развіццё жанру ў рускай літаратуры, у якасці “прыступак” да нон-фікш ён называе такія “нявымышленыя” творы, як “Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву” А. Радзішчава, “Былое і думы” А. Герцана, “Архіпелаг ГУЛАГ” А. Салжаніцына і інш. “Non fiction сёння – гэта і заснаваная на сапраўдных сведчаннях проза Святланы Алексіевіч, і апавяданне Анатоля Прыстаўкіна пра людзей, асуджаных да смяротнага пакарання…” [2].

А. Ю. Новік прапануе “разумець пад нон-фікшн літаратуру, якая належыць да інтэлектуальна-мастацкага дыскурсу і дзякуючы імпліцытнай ролі аўтара пры арганізацыі дакументальных сведчанняў у паўнавартасны твор выконвае інфармацыйна-гнасеалагічную і мастацка-эстэтычную функцыі” [1, с. 22]. Акрамя таго, даследчыца вылучае дзве плыні беларускай літаратуры нон-фікшн – аўтабіяграфічную (дзённікі, мемуары, споведзі, аўтабіяграфіі, інш.) і дакументальна-мастацкую (мастацкія хронікі, белетрызаваныя біяграфіі, крытыка, фрагментарная проза і інш.). У якасці разнавіднасцей нон-фікшн яна таксама разглядае літаратурна-мастацкую журналістыку і містыфікацыі [1, с. 22].

Мы пры аналізе мастацкіх з’яў называем нон-фікшн прозу, дзе дамінуе дакументальны пачатак, адлюстроўваюцца факты рэчаіснасці, што выражаюцца праз інтэрв’ю, лісты, занатаваныя перажыванні, аднак яны абавязкова па-мастацку апрацаваныя і падаюцца *праз прызму ўспрымання аўтара*. Аўтарская суб’ектыўнасць і ўключанасць у падзеі з’яўляецца, па нашым меркаванні, адной з найбольш важных прыкмет падобных твораў.

## Літаратура

1. Новік, Г. Ю. Дакументальная проза (нон-фікшн) на мяжы XX–XXI стст.: тэарэтычны аспект [Электронны рэсурс] / Г. Ю. Новік // Журнал Белорусского государственного университета. Филология = Journal of the Belarusian State University. Philology. – 2017. – № 1. – С. 17–23. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/182705/1/17-23.pdf. – Дата доступу: 25.03.2021.

2. Чупринин, С. И. Non-fiction литература [Электронный ресурс] / С. И. Чупринин // ЛитМир. – Режим доступа: https://www.litmir.me/br/?b=105181&p=87. – Дата доступа: 25.03.2021.